# Каэфіцыент дэпутацкай карысці

## Савет становіцца сапраўды дзейсным, калі жыве праблемамі людзей

**Аўтарытэт улады – з'ява зусім не эфемерная, як можа падацца на першы погляд. Гэты аўтарытэт, павага да прадстаўнікоў уладных структур вызначаюцца, на самай справе, вельмі простай ісцінай. Можа ўлада нешта зрабіць, здольная яна пераўтварыць рэчаіснасць на карысць кожнага з нас – тады і аўтарытэт у яе, і пашана наша ды падтрымка. Не можа, прыкрываецца-скардзіцца на недахоп сродкаў, кампетэнцыі, рэсурсаў, апраўдваючы ўласную бескарыснасць для грамадскіх інтарэсаў, – і крывая чалавечага даверу ў сацыялагічных даследаваннях няўхільна паўзе ўніз. Дзейснасць – вось галоўны крытэрый, якім кіруемся мы ў сваіх адносінах з уладнымі структурамі любога ўзроўню.**

### ПАВЫШЭННЕ АДКАЗНАСЦІ І САМАСТОЙНАСЦІ

Не будзем адмаўляць відавочнае – на працягу многіх гадоў, яшчэ, бадай, і за савецкім часам, найменшым аўтарытэтам, ці, як цяпер кажуць сацыёлагі, найменшым даверам у насельніцтва карысталася менавіта мясцовая ўлада. У вертыкалі структур, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае кіраванне, мясцовыя органы выканаўчай і прадстаўнічай улады, і найперш Саветы дэпутатаў, мелі найменшы рэйтынг. «Ад іх нічога не залежыць!» – катэгарычна заяўляла большасць з нас, і гэтым вызначаліся і наша актыўнасць, а хутчэй, пасіўнасць падчас выбараў, і нашы адносіны да Саветаў дэпутатаў наогул. Нядзейсная, бяззубая, пасіўная ўлада – не ўлада!

Зразумела, што сітуацыю неабходна было выпраўляць. Мясцовыя Саветы, мясцовыя выканкамы – аснова дзяржаўнай улады ў краіне. Гэта фундамент, на якім выбудоўваецца ўся вертыкаль. А таму ён павінен быць моцным, надзейным і эфектыўным.

Тэма адзінага дня інфармавання насельніцтва ў ліпені 2010 года – «Удасканаленне работы мясцовых Саветаў з насельніцтвам»

Зрэшты, і эфектыўнасць, і дзейснасць мясцовай улады вызначаецца вельмі лёгка. У кожнага чалавека ёсць запатрабаванні, праблемы, пытанні, якія вырашаюцца ці павінны вырашацца менавіта на мясцовым узроўні. Ну, не губернатар жа павінен клапаціцца пра канкрэтную лямпачку на вуліцы канкрэтнай вёскі. І не прэм'ер-міністр мусіць вырашаць, на якім лапіку пашы пасвіць жывёлу жыхарам якога-небудзь пасёлка. Для паспяховага вырашэння безлічы падобных праблем абсалютна дастаткова кампетэнцыі мясцовай улады.

Калі прыняць як факт дапушчэнне, што свядомых сабатажнікаў, якія пранiклі ў структуры мясцовых Саветаў і выканкамаў, няма, тады становіцца відавочным, што многія пытанні не вырашаюцца, тармозяцца, зацягваюцца толькі таму, што ўлада... проста не ведала пра іх існаванне! Пра гэтыя праблемы не напісалі ва ўказе Прэзідэнта, на гэтых пытаннях не засяродзілі ўвагу ў чарговай пастанове Савета Міністраў – і ўсё. Іншых крыніц інфармацыі многія мясцовыя Саветы і выканкамы проста не бачаць і не ведаюць.

Менавіта таму і Прэзідэнтам, і яго Адміністрацыяй, і парламентам краіны сёння галоўнай задачай мясцовых Саветаў абвяшчаецца ўдасканаленне работы з насельніцтвам. Чым жыве чалавек? Што яго хвалюе? Якія праблемы становяцца самымі балючымі ў кожнай канкрэтнай вёсцы, на кожнай канкрэтнай вуліцы – гэта ўлада павінна ведаць. Ведаць, каб дапамагчы людзям. Бо рэальных магчымасцей дапамагчы сёння ў мясцовых Саветаў больш, чым было калі-небудзь.

На пачатку бягучага года, 4 студзеня, быў прыняты новы варыянт закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Гэтым актам адносіны грамадства і мясцовай улады ўрэгуляваны ў комплексе, а акцэнт зроблены менавіта на павышэнні ролі мясцовага самакіравання. Закон перадаў мясцовым органам улады ўсе неабходныя паўнамоцтвы на тое, каб самастойна вырашаць мноства праблем, якія ўзнікаюць на месцах. Тым самым гэты нарматыўны акт даў імпульс да ўмацавання

мясцовых Саветаў і выканкамаў дзеля павышэння эфектыўнасці іх работы з насельніцтвам. Ім дадзены шэраг дадатковых паўнамоцтваў, на заканадаўчым узроўні замацаваны прынцып «аднаго акна», спрошчаны некаторыя адміністрацыйныя працэдуры.

Важным аспектам дзейнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання становіцца, як кажуць спецыялісты-сацыёлагі, фактар інтэграцыі. Маецца на ўвазе, што самакіраванне аб'ядноўвае людзей, якія пражываюць на нейкай кампактнай тэрыторыі. У кожнага з нас роўныя правы і роўныя магчымасці для вырашэння сацыяльных праблем і запатрабаванняў. І яны не залежаць ад таго, галасавалі мы за канкрэтнага дэпутата ці аддалі перавагу яго канкурэнту.

А самае галоўнае – і Прэзідэнт, і парламент новым органам мясцовай улады, якія толькі што, па вясне, былі абраныя ва ўсёй краіне, далі, так бы мовіць, устаноўку (а можна гэта назваць і дзяржаўным заказам): павысіць інтэнсіўнасць і эфектыўнасць работы з насельніцтвам. Пачуць кожнага грамадзяніна. Разабрацца з кожнай праблемай. Вырашыць кожнае набалелае пытанне.

Так, мясцовыя Саветы разглядаюць і спрабуюць вырашыць самы шырокі спектр пытанняў, у тым ліку эканамічных, сацыяльных, культурных і нават палітычных. Безумоўна, што эфектыўнасць гэтай дзейнасці залежыць, у тым ліку, і ад персанальнага складу Саветаў, ад таго, хто канкрэтна заручыўся даверам выбаршчыкаў. Але яшчэ больш важна, які агульны напрамак зададзены дзейнасці Савета. Бо галоўнае, што патрабуецца ад дэпутацкага корпуса, галоўнае, чаго мы ад яго чакаем і на што спадзяёмся: ён будзе спрыяць павышэнню ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва.

Толькі пры ўмове такой работы дзейнасць мясцовых Саветаў дэпутатаў можа лічыцца здавальняючай і для дзяржавы, і для грамадскасці.

## ДАВЕР, ЯКІ ТРЭБА АПРАЎДВАЦЬ

Віктар Невяровіч, старшыня Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў, спачатку доўга не пагаджаўся на інтэрв'ю. Маўляў, чалавек ён на гэтай пасадзе новы, дэпутацкага вопыту ці дасягненняў, якімі можна было б ганарыцца, займець не паспеў. А таму ці не лепш карэспандэнту пашукаць каго іншага?

Вось толькі пра вопыт свой Віктар Баляслававіч дарэмна так сціпла гаварыў. Шмат гадоў працаваў ён у падатковай інспекцыі. Апошнім часам, да выбрання старшынёй Савета, быў начальнікам упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама. Таму праблемы, з якімі сутыкаюцца жыхары і горада, і раёна, яму знаёмы добра. А дэпутацкі вопыт – справа, урэшце, нажыўная.

А вось тое, што чалавек на сваёй сённяшняй пасадзе ён новы, – толькі лепш. Урэшце, да Саветаў дэпутатаў дзяржава і грамадства падыходзяць сёння з новымі запатрабаваннямі. Можа, менавіта новыя людзі і ўнясуць у іх дзейнасць свежы струмень?



На пасяджэнні Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў. Справа – Віктар Невяровіч

Прынамсі, было цікава даведацца, як ставіцца старшыня да дзейнасці Савета, якія задачы бачыць найбольш важнымі, якія напрамкі работы будуць найперш у яго полі зроку.

– Перад мясцовымі Саветамі дэпутатаў, абранымі гэтай вясной, пастаўлены вялікія задачы, – адзначыў Віктар Невяровіч. – Зрэшты, яны былі акрэслены Трэцім Усебеларускім народным сходам, потым канкрэтызаваны у Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту. І найперш гэта работа з насельніцтвам, клопат пра кожнага чалавека.

Людзі аказалі вялікі давер кожнаму з дэпутатаў, за якога прагаласавалі ў час выбараў. І кожны абраны ў мясцовыя органы ўлады павінен стаць сувязным звяном паміж людзьмі з іх праблемамі і выканаўчай уладай з яе магчымасцямі. Практыка паказвае, што калі дэпутат кантралюе нейкае пытанне, яно вырашаецца, як правіла, больш хутка і больш эфектыўна. А таму я лічу, што чым часцей мы будзем бываць у сваіх акругах, тым больш будзем у курсе тых праблем, якія хвалююць жыхароў. А будзем у курсе – будзем з праблемамі спраўляцца. І тады

людзі будуць яшчэ болей нам давяраць. А гэта дарагога каштуе.

Лічу, што актыўная дзейнасць кожнага дэпутата дасць магчымасць у выніку зменшыць колькасць зваротаў грамадзян у райвыканкам, іншыя дзяржаўныя структуры. Такім чынам, у кіраўніцтва выканаўчай улады будзе больш часу і магчымасцей надаваць увагу самым актуальным праблемам развіцця рэгіёну. Шырока вядома, што многія пытанні, з якімі чалавек спрабуе «штурмаваць» больш высокія інстанцыі, можна з лёгкасцю вырашыць хутка і на месцы. Трэба толькі ўмець слухаць людзей і мець жаданне ім дапамагчы.

Адзначу, што за апошнія гады склалася пэўная сістэма работы органаў мясцовай улады. Але сёння яе трэба ўдасканальваць і развіваць, дабівацца большай дзейснасці. Таму як старшыня раённага Савета я буду штомесяц патрабаваць ад кожнага дэпутата справаздачу, што зроблена ў выбарчай акрузе. Справаздачы будзем таксама абавязкова заслухоўваць падчас правядзення сесій, на пасяджэннях камісій і прэзідыума Савета.

Безумоўна, шмат увагі мы будзем надаваць якаснай падрыхтоўцы сесій. Пытанні, якія будуць выносіцца на разгляд дэпутатаў, павінны быць важнымі і злабадзённымі, а рашэнні, якія ў выніку прыме Савет, – канкрэтнымі і эфектыўнымі.

Важным кірункам работы кожнага абранніка лічу правядзенне Дзён дэпутата. У гэтыя дні будзе, безумоўна, наладжаны прыём грамадзян у кожнай акрузе, але не менш важна, што дэпутаты наведаюць праблемныя сем'і, адзінокіх людзей, ветэранаў вайны і працы. Так мы больш даведаемся аб праблемах, з якімі сутыкаюцца людзі, а часам, магчыма, пачуем і падказку, карысную параду ад людзей старэйшага пакалення.

Значная роля ў вырашэнні дзяржаўных пытанняў адводзіцца і Саветам базавага ўзроўню – сельскім і пасялковым. Асоба старшыні сельскага Савета ў такіх варунках набывае асаблівае значэнне. Адзначу, што па выніках апошніх выбараў у раёне змянілася амаль палова старшынь сельскіх Саветаў дэпутатаў. Гэтыя пасады занялі людзі з актыўнай жыццёвай і грамадзянскай пазіцыяй, з пэўным аўтарытэтам сярод аднавяскоўцаў. Вопыту менавіта дэпутацкай работы ў іх пакуль бракуе, таму раённы Савет зробіць захады па арганізацыі вучобы новых дэпутатаў, арганізацыі стажыровак у больш дасведчаных калег. Мы ўжо вызначылі базавыя сельсаветы, у якія будзем накіроўваць нашых старшынь «на практыку».

У першую чаргу старшыні сельсаветаў павінны займацца навядзеннем парадку на зямлі, добраўпарадкаваннем вёсак. Апірацца ў гэтай рабоце трэба на кіраўнікоў арганізацый, што знаходзяцца на тэрыторыі Савета, дэпутатаў, старастаў вёсак. Зрэшты, проста на нераўнадушных, актыўных людзей, якія ўсёй душой хвалююцца за развіццё сваіх населеных пунктаў. Такіх у нашым раёне, паверце, хапае.




Напярэдадні новага, 2010 года жыхары Маладзечна атрымалі падарунак – сучасны аўтавакзал

І, безумоўна, яшчэ адна важная задача, якая павінна турбаваць сельскія Саветы і пра якую не так даўно гаварыў Прэзідэнт, – развіццё ўласных падсобных гаспадарак. Рэалізацыі яе была прысвечана не так даўно абласная селектарная нарада. Увага выканаўчай і прадстаўнічай улады на месцах звернута на выдзяленне грамадзянам зямлі для развіцця прыватных гаспадарак, на аказанне дапамогі ў нарыхтоўцы кармоў, павелічэнне вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Калі чалавек жадае трымаць гаспадарку, ён павінен мець падтрымку, бо гэта імкненне – у дзяржаўных інтарэсах. Тым больш што развіццё падсобнай гаспадаркі можа прынесці ўласнікам і сякі-такі дадатковы даход. Папрацаваць, безумоўна, давядзецца, але хто сказаў, што дабрабыт сам плыве ў рукі? Толькі працай прымнажаецца багацце.

## ДАРОГА З ДВУХБАКОВЫМ РУХАМ

Улада павінна быць інфармаванай, але ўлада павінна ўмець і інфармаваць. Ведаць, чым жыве чалавек, важна, але не менш важна, каб і кожны грамадзянін ведаў, чым заняты і чым заклапочаны той жа Савет альбо выканкам. Давер найперш з'яўляецца там, дзе людзі гавораць між сабой шчыра і адкрыта.

Ролю мясцовага друку і мясцовага радыё (а дзе яно ёсць – і тэлебачання) пераацаніць цяжка. Чалавек – істота сацыяльная, але і на сваё ўласнае ніколі не забудзецца. Свая вёска, свой раён – і свая газета, сваё радыё. Свая, уласная крыніца інфармацыі. А таму, колькі б ні прадказвалі скептыкі хуткае сканання ў няпростых рынкавых умовах мясцовым СМІ, раённыя газеты выжываюць. І не проста выжываюць, але і (вядома, з пэўнай дапамогай дзяржавы, зацікаўленай у тым) няблага развіваюцца.

«Маладзечанская газета», якая сёння выходзіць ажно на 24 палосах, – выданне сучаснае, сімпатычнае і, што немалаважна, сур'ёзнае. Раённыя журналісты імкнуцца да таго, каб ні адна навіна краю і ніводная праблема, якая турбуе землякоў, не засталіся па-за ўвагай газеты. І чытачы плацяць сваёй «раёнцы» ўдзячнасцю.

Галоўны рэдактар «Маладзечанскай газеты» Аляксандр Лазоўскі згодны, што адзін з напрамкаў удасканалення работы мясцовых органаў з насельніцтвам пралягае менавіта праз мясцовы друк.



Галоўны рэдактар «Маладзечанскай газеты» Аляксандр Лазоўскі

– Літаральна некалькі дзён таму мы атрымалі з выканкама копію пісьма за подпісам першага намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Леаніда Крупца да старшыні аблвыканкама Барыса Батуры, – расказвае Аляксандр Іванавіч. – У гэтым пісьме Леанід Крупец просіць губернатара арганізаваць шырокае асвятленне дзейнасці органаў мясцовага самакіравання на старонках раённага друку і на радыё. Мы ўжо вызначылі выканаўцаў – намесніка галоўнага рэдактара і загадчыка аддзела радыёвяшчання, якія будуць сачыць за гэтым напрамкам нашай дзейнасці і даваць мне раз у квартал справаздачу.

Я думаю, невыпадкова звярнуўся кіраўнік вышэйшай структуры заканадаўчага органа па дапамогу да журналістаў. Сапраўды, як можна расказаць людзям пра дзейнасць і Палаты прадстаўнікоў, і Савета Рэспублікі, і мясцовых прадстаўнічых органаў улады, калі не асвятляць іх работу ў друку? Так, нейкія звесткі можна данесці да нейкай групы людзей падчас правядзення адзіных дзён інфармавання, можна расказаць нешта пры сустрэчах дэпутатаў з працоўнымі калектывамі. Але самыя масавыя сродкі распаўсюджвання інфармацыі – радыё, тэлебачанне і газета.

Гэты ліст проста будзе яшчэ адным стымулам у нашай рабоце. Мы ўсё ж пазіцыянуем сябе не як «чацвёртую ўладу», а як людзей, якія даводзяць палітыку дзяржавы і ўладных структур да чытачоў і слухачоў.

Тэма дзейнасці мясцовай улады шырока прысутнічае на старонках нашай газеты. І не толькі таму, што адным з сузаснавальнікаў газеты з'яўляецца раённы Савет дэпутатаў (а ў нас тры сузаснавальнікі – райвыканкам, райсавет і мы самі, калектыў рэдакцыі). Проста таму, што мы не можам жыць у інфармацыйным і прававым вакууме. Мы разумеем сваю ролю і месца ў справе інфармавання насельніцтва.

І, дарэчы, не толькі ў справе інфармавання, але і пэўнага ўдзелу ў заканадаўчым працэсе, нарматворчай дзейнасці. Чаму? Таму што я не сумняваюся, што выказванні жыхароў раёна, горада, іх меркаванні, надрукаваныя на нашых старонках, улічваюцца ў рабоце і парламентарыяў, і дэпутатаў мясцовых Саветаў, і чыноўнікаў выканкама. А выказванні гэтыя могуць з'явіцца ў самых розных матэрыялах – на палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя тэмы.

Адзначу таксама, што тлумачыць важнасць гэтай работы нам асабліва не трэба. Я сам не адзін раз выбіраўся ў раённы Савет дэпутатаў. Трэці раз запар рэдактар «Радыё Маладзечна» становіцца дэпутатам райсавета. Словам, мы маем самае непасрэднае дачыненне да дзейнасці прадстаўнічай улады.

Мы рэгулярна расказваем пра дзейнасць і ўсяго раённага Савета, і асобных яго прадстаўнікоў. Нашых журналістаў пастаянна запрашаюць на сесіі Савета, пасяджэнні камісій. Пішам пра тое, як рэалізуюцца

прынятыя рашэнні, стараемся расказаць пра дзейнасць дэпутацкага корпуса. Многія дэпутаты, дарэчы, самі звяртаюцца да нас са сваімі матэрыяламі альбо запрашаюць журналістаў на сустрэчы з выбаршчыкамі. І ў гэтым не варта шукаць нейкае палітыканства ці імкненне да папулізму, імкненне здабыць з дапамогай газеты аўтарытэт. Проста чалавек, які займаецца дэпутацкай дзейнасцю, жадае расказаць сваім выбаршчыкам, што здолеў зрабіць для жыхароў.

Актыўна супрацоўнічае з газетай дэпутат Палаты прадстаўнікоў ад нашага краю Мікалай Жгун. Былы кіраўнік політэхнічнага каледжа, ён часта працуе ў акрузе, выступае ў працоўных калектывах. Упэўнены, што хутка мы зноў убачым яго ў рэдакцыі з матэрыялам, тым больш што толькі што скончылася чарговая сесія парламента.



Маладзечанцы вывучаюць праект аднаўлення гістарычнай забудовы горада

Не першы раз вылучаецца ад Мінскай вобласці і Маладзечанскага раёна, у прыватнасці, Анатоль Новікаў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю. І часта бывае ў калектывах, на мерапрыемствах раённага маштабу.

Газета і радыё атрымліваюць вельмі многа карэспандэнцыі. Часцей за ўсё, вядома, людзі звяртаюцца па побытавых пытаннях. Прадстаўнікі ўлады даведваюцца з нашых выступленняў аб праблемах, якія існуюць у раёне, і на нашы крытычныя заўвагі абавязкова адказваюць.

Яшчэ адзін цікавы напрамак вывучэння грамадскай думкі – прыёмы, якія рэгулярна праводзяць у раёне высокія дзяржаўныя асобы. Не так даўно, напрыклад, у Маладзечне працаваў памочнік Прэзідэнта Беларусі – галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай Іванчанка. Мы падрабязна пісалі пра гаворку, якая адбылася ў яго з жыхарамі. Пісалі і пра тое, што гаварылі людзі падчас прыёму, які правёў старшыня абласнога Камітэта дзяржкантролю Уладзіслаў Цыдзік.

Словам, газета забяспечвае зваротную сувязь – мы не толькі інфармуем насельніцтва, але і ўладным структурам расказваем пра тыя праблемы, якія хвалююць людзей. Іншая справа, што, на маю думку, гэтую зваротную сувязь можна зрабіць яшчэ больш дзейснай. Для гэтага мы маглі б рэгулярна абагульняць усе тыя выступленні і пісьмы, што да нас прыходзяць, а раённы Савет дэпутатаў мог бы разглядаць тэмы, што найперш хвалююць людзей. Мы, такім чынам, зрабілі б пэўны аналіз гэтых пытанняў – і журналісцкі, і ў нейкай ступені сацыялагічны.

Вядома, гэта была б дадатковая нагрузка на газету. Але, урэшце, мы і працуем дзеля таго, каб нешта рабілася, нешта рухалася. Мы, журналісты, не імкнёмся, каб наша роля нейкім чынам падкрэслівалася. Але іншым разам усё ж хочацца, каб на сесіі Савета ці на выканкаме прагучала: пытанне вырашана, у тым ліку дзякуючы газеце. Бо, па вялікім рахунку, мы ўсе робім адну справу.

## НА БАЗАВЫМ УЗРОЎНІ

Самы бліжэйшы, самы «родны» для грамадзяніна прадстаўнік яго інтарэсаў – дэпутат сельскага Савета. На гэтым, базавым узроўні якраз і вырашаецца большасць нашых побытавых праблем.

Дык як жа працуецца на базавым узроўні? Чым займаецца сёння сельскі Савет? І дзе шукаць рэзервы, якія маглі б актывізаваць работу мясцовай улады з насельніцтвам? Старшыня Ільянскага сельскага Савета дэпутатаў Вілейскага раёна Вольга Гараніна лічыць, што асноўная фігура, якая можа паўплываць на сітуацыю, – асоба дэпутата.

– У сельскім Савеце першым памочнікам у рабоце з насельніцтвам з'яўляецца дэпутат, – перакананая Вольга Чаславаўна. – Дэпутацкі корпус і актыў сельскага Савета (старасты, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, загадчыкі Дамоў культуры, бібліятэк) – гэта тыя людзі, якія выносяць на сваіх плячах асноўны цяжар, асноўную нагрузку.

Галоўная форма нашай работы з грамадзянамі – правядзенне сходаў. Адзін раз у два месяцы абавязкова збіраем людзей. Акрамя таго, у чатырох населеных пунктах на тэрыторыі Савета ёсць дамы сацыяльных паслуг. Там мы таксама сустракаем-

ся з насельніцтвам і даносім да людзей інфармацыю і свае планы.

Для старастаў вёсак мы рыхтуем спецыяльныя папкі, у якія ўкладваем усю неабходную ім у дзейнасці дакументацыю. Напрыклад, правілы добраўпарадкавання населеных пунктаў, спісы прадпрыемстваў, арганізацый раёна, тэлефоны службаў, куды можна пазваніць і звярнуцца з набалелай праблемай. І абавязкова кантактныя тэлефоны і адрасы ўстаноў, якія працуюць па прынцыпе «аднаго акна», і графік іх працы.

Калі ў вёсцы ёсць актыў, вырашыць можна любое пытанне. У прыватнасці, у мінулым годзе прывялі ў парадак могілкі ў вёсцы Асцюковічы. Сельскі Савет знайшоў сродкі і паставіў плот, а на фарбу старасты сабралі грошы ў пяці населеных пунктах, людзі з якіх хаваюць сваіх блізкіх на тых могілках. Папрацавалі разам з жыхарамі – і вынік ёсць. Ці, напрыклад, у вёсцы Бязводнае не так даўно арганізавалі з дапамогай саміх жыхароў спільванне дрэў, хмызняку, а сельсавет падумаў, як вывезці гэтае галлё.

Праблемы ўзнікаюць якраз тады, калі не атрымліваецца ў нейкай вёсцы знайсці актывістаў. Калі няма каго прыцягнуць да работы.



Старшыня Ільянскага сельскага Савета дэпутатаў Вілейскага раёна Вольга Гараніна

Па цэнтральных дарогах, якія на тэрыторыі сельсавета праходзяць праз Ілью і пасёлак Партызанскі, на вуліцах мы паставілі на бюджэтныя сродкі прыгожы плот – аднолькавы для ўсіх двароў. Сёння ставім яго ў вёсцы Асцюковічы, тое ж плануем трошкі пазней зрабіць у вёсцы Абадоўцы. А фарбуюць каля хат плот самі гаспадары.

За бюджэтныя сродкі мы можам таксама паставіць плот адзінокім людзям – тым, каму больш няма адкуль чакаць падмогі. Ёсць у нас такое прадпрыемства, «Ільянская лесапільная вытворчасць». Яны нам дапамаглі, падаравалі штыкетнік. І мы змаглі многім дапамагчы – і ветэранам Вялікай Айчыннай, і проста адзінокім грамадзянам.

Людзі звяртаюцца ў сельсавет па самых розных пытаннях. Рамонт дарог, водаправода, вулічнае асвятленне, выдзяленне зямельных участкаў... Збор малака – таксама вялізны клопат сельсавета. Альбо вось актуальная праблема апошняга часу – замена адной пашы на іншую. Людзей становіцца ўсё менш, скарачаецца і колькасць жывёлы. У адной вёсцы сёння ёсць толькі сем кароў, напрыклад. Дзе ты для іх цэлае поле знойдзеш? Але выйсце ёсць: мы аб'ядноўваем некалькі населеных пунктаў і шукаем для іх агульную пашу, на якой зручна было б пасвіць усім.

Нарэшце, вялікай праблемай апошнім часам стаў пошук нашчадкаў, каб разабрацца з хатамі, якія засталіся без гаспадароў. На сённяшні момант, напрыклад, на тэрыторыі нашага Савета 44 будынкі не атрымалі належнага афармлення. Гаспадары памерлі. Дзе шукаць нашчадкаў? У якіх гарадах і ў якіх краінах? Без дапамогі суседзяў ніяк не справішся. Без нашых старастаў, без нашых дэпутатаў сельсавет і выканкам, у якім працуе толькі пяць чалавек, з такім аб'ёмам работ проста не справіліся б!

Кажуць іншы раз, што падчас апошніх выбараў у дэпутаты мясцовых Саветаў абрана шмат кіраўнікоў. Бы папікаюць нечым! А я шчыра скажу: для мяне, як прадстаўніка ўлады ў гэтым сельсавеце, дэпутат больш карысны менавіта тады, калі ён кіраўнік. У такім выпадку ён здольны больш аператыўна і якасна вырашыць любое пытанне.

У цяперашнім дэпутацкім корпусе ёсць і кіраўнікі, і настаўнікі, і загадчык клуба, і загадчыца фельчарска-акушэрскага пункта – а значыць, ёсць з кім працаваць. Гэта якраз тыя, хто можа знайсці кантакт з людзьмі. І зрабіць для іх тое, што грамадзяне і чакаюць ад прадстаўнікоў улады на месцах.

***

Гэтыя тры сустрэчы, тры маналогі – толькі маленькая частка таго, што здолеў пабачыць, з кім паспеў пагаварыць падчас некалькіх дзён камандзіроўкі на поўнач ад Мінска. Але эпізоды гэтыя тыповыя, і яднае герояў майго матэрыялу адно – жаданне зрабіць так, каб дзейнасць мясцовай улады была больш блізкай да людзей. Да іх праблем. Да іх запатрабаванняў.

«Хацелі як лепей...» – сказаў аднойчы класік афарызмаў найноўшага часу Віктар Чарнамырдзін. Чамусьці здаецца, што гэтым разам яго афарызм застанецца не актуальным.

**Максім МІКАЛАЕЎ**